...Я беседовала с Красуцким и никак не могла понять, почему наши высшие чины за все эти годы не додумались проехаться по деревням, поговорить с умными людьми, да и сделать так, как им скажут. Ведь это же гораздо проще, чем ломать головы над тем, какое новое название написать на старых шильдах колхозных контор! И, главное, — результативнее, потому что в кратчайшие сроки у деревни открылось бы "второе дыхание" и она завалила бы страну дешевым мясом, хлебом, молоком, картошкой и овощами!

На прощание я спросила у фермера:

— А вы бы хотели, чтобы потом дети трудились рядом с вами?

— Да, — ответил он задумчиво. — Я бы очень хотел выстоять, и чтобы дети мои занимались именно сельским хозяйством.

— Может быть, это и называется призванием?

— Может быть, — устало согласился Красуцкий...

**Анна АРТЮШКЕВИЧ.**

*Смолевичский район.*

ГДЕ ЭТО ВИДАНО...

# Дело Захаренко полно тайн

***Как сообщалось в прессе, мать похищенного оператора ОРТ Дмитрия Завадского обратилась в суд на действия Прокуратуры Республики, которая отказала ей в предоставлении копии постановления о приостановлении расследования дела по факту насильственного похищения ее сына. Такая судьба и уголовного дела по факту насильственного похищения Ю.Захаренко.***

24 января 2003 года я находился на приеме у начальника следственной части прокуратуры города Минска Е.С.Синяка. Обратился по вопросу о получении копии постановления о приостановлении предварительного следствия по уголовному делу Юрия Захаренко.

Во время разговора в кабинет вошел старший следователь прокуратуры г.Минска В.М.Чумаченко (который занимается расследованием данного дела) и беспричинно стал браниться в мой адрес. Я попросил Е.С.Синяка, чтобы тот образумил своего подчиненного. Однако В.М.Чумаченко попытался схватить меня за одежду, чтобы, возможно, нанести удар. Только благодаря усилиям Е.С.Синяка, который сдержал нападавшего, драки не произошло. Е.С.Синяк сказал, чтобы я написал заявление по поводу получения данного постановления.

Я посчитал, что своими неправомерными действиями В.М.Чумаченко причинил моральный вред не только мне, но и семье Юрия Захаренко. Об этом происшествии я сообщил семье Захаренко. После обсуждения данной ситуации решили заявить отвод старшему следователю прокуратуры города Минска В.М.Чумаченко от дальнейшего расследования уголовного дела.

Прокурор города Минска Н.Н.Кулик дал ответ, что мои доводы насчет неадекватного поведения В.М.Чумаченко не подтвердились. Отказано и в получении постановления о приостановлении предварительного расследования по делу. Собственно говоря, я другого ответа и не ожидал. Но меня по-прежнему тревожат следующие вопросы. Почему прокуроры так равнодушны к судьбе исчезнувших? Почему они, я бы сказал, с какой-то агрессией относятся к любому высказыванию родственников, когда те критикуют правоохранительные органы за их бездействие. Взять хотя бы последний случай. Ведь это их законное право получить данное постановление, поскольку в нем отражается вся работа следствия по поиску их родственника. И потом: потерпевшие решают, согласиться с решением следователя или не согласиться, обжаловав его.

Я считаю, что такие требования справедливые. Сколько ждать от них ответа о судьбе Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского и Дмитрия Завадского?

Ольга Захаренко была вынуждена еще раз письменно обратиться к прокурору города Минска с заявлением о моем допуске в качестве представителя интересов семьи Захаренко, а также в выдаче этого постановления. Тем более что постановление о приостановлении предварительного расследования необходимо для гражданского дела о признании Юрия Захаренко умершим. Какая тайна кроется в этом постановлении? Прокуратура данное постановление не хочет выдать не только родственникам Юрия Захаренко, но и отказывает в запросе судье Виктору Белянину, который ведет гражданский процесс.

Такого еще в судебной практике не было, чтобы суд дважды направлял запрос в прокуратуру города Минска о предоставлении данного постановления, а в ответ — тихое молчание. В связи с чем Ольга Захаренко заявляет отвод следователю В.М.Чумаченко от дальнейшего участия в расследовании обстоятельств исчезновения ее мужа.

Я, как представитель Ольги Захаренко, обратился в Прокуратуру Республики и Верховный суд, может, там найдутся мужественные и принципиальные люди, которые смогут четко объяснить причины всех тайн, которые кроются как в гражданском, так и в уголовном делах.

Семья Захаренко обращается ко всем гражданам, в первую очередь к тем, кто занимался расследованием обстоятельств исчезновения Юрия Захаренко. Семья не верит, что при нынешней власти можно будет узнать обо всех обстоятельствах насильственного похищения экс-министра МВД Юрия Захаренко. А поэтому просит коллег по работе сообщить любую информацию, которая хоть каким-то образом прольет свет по данному делу.

**Олег ВОЛЧЕК, представитель семьи Захаренко.**

# Глядзіце сабе пад ногі, бо там — гісторыя!






*Так выглядае гістарычны люк, ніжэй — яго рэканструкцыя.*

**Фота аўтара.**

Мінск не адносіцца да тых гарадоў, якія могуць пахваліцца высокамастацкім афармленнем накрывак для каналізацыйных люкаў. У большасці замежных краін іх ужо даўно скарыстоўваюць або як дадатковыя рэкламныя плошчы, або як мастацкае ўпрыгожванне. У нас жа накрыўку люка як рэкламу скарыстаў толькі буцік Calambia, што на вуліцы К.Маркса. Як упрыгожванне, люкі выглядаюць ва ўнутраным двары чэшскага пасольства, што знаходзіцца у Верхнім горадзе. І ўсё! На гэтым палёт фантазій у нас скончыўся! Усе астатнія накрыўкі выкананы ў стылі стандартнай штампоўкі.

Але на плошчы Незалежнасці, перад Домам урада, да нядаўняга часу існавалі два каналізацыйных люкі, накрыўкі якіх былі выраблены і пакладзены на сваё месца прыблізна напрыканцы 20-х — пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя. Аб чым сведчаць надпісы, выкананыя дарэформенным правапісам, менавіта на тарашкевіцы, якая была распаўсюджана да 1933 года.

І, канешне, больш за ўсё засяроджвае на сабе ўвагу скарыстанне гістарычнай назвы горада — Менск — якая пэўны час афіцыйна ўжывалася ў БССР.

Зроблены націск на тое, што надпіс тарашкевіцай сустракаецца таксама і на пастаменце помніка Леніну перад Домам урада.

Некаторыя гісторыкі і архітэктары прапануюць лічыць з'яўленне Дома ўрада, помніка Леніну і дадзеных люкаў як аднačасна ўтвораны гістарычны ландшафт, а таму ёсць прапанова надаць яму афіцыйны статус "гістарычнай каштоўнасці".

Толькі нягледзячы на тое, што хочацца нам заўсёды як мага лепш, атрымліваецца ўсё роўна, як заўсёды. І ў сувязі з работамі па добраўпарадкаванні плошчы Незалежнасці быў страчаны адзін з гістарычных люкаў. А набліжэнне другой чаргі работ стварае пагрозу для люка, які застаўся. Распавядае архітэктар "Мінскпраекта" Зміцер МУРАШКА:

— Працы па добраўпарадкаванні той тэрыторыі былі распачаты ў лістападзе 2002 года. Калі люк пачалі шукаць, то будаўнікі паведамілі, што ён дэманціраваны і звезены на распілоўку. Гэтая недарэчнасць была выклікана тым, што яны не былі інфармаваны. Хаця ў дзённік агляду было занесена, што тут знаходзяцца два каштоўных люкі, указаны і месцы. Але працы выконваліся будаўнічым упраўленнем. Яны не чытаюць дзённіка агляду па плошчы. Гэта дырэктыўны аб'ект, яго трэба як мага хутчэй завяршаць, людзі нервуюцца. Люк звезлі, не ведаючы што робяць.

— І зараз галоўнае — захаваць другі люк, надаць яму статус гістарычнай каштоўнасці?

— Так. І трэба захаваць яго на сваім гістарычным месцы. Бо менавіта на гэтым месцы ён прадстаўляе гістарычны інтарэс і цікавасць для грамадскасці. Як выраб часоў ранняй Савецкай Беларусі, ранняй беларусізацыі... Зараз вырашылі часова гэты люк не дэманціраваць. Дэмантаж вымагае альбо замену абоймы, або засыпку калодзежа, бо люк мае нестандартны памер, і няма чым замяніць гэтую накрыўку.

Зараз рыхтуюцца яго памеры ў Дэпартамент аховы помнікаў на разгляд камісіі. Каб люк прызначыць часткай гістарычнага ландшафту, гістарычнай зоны Дома ўрада. Разглядаць яго як цэльнасць ансамбля. Тут пры добрай раскрутцы можа быць неблагі турыстычны аб'ект, які можа выклікаць цікавасць і ў турыстаў, і ў мінчукоў.

**Дар'я ГАЎРЫЛАВА.**

РЭГІЁН

## Прыцiснулі аматараў тытуню

Загад рэктара Аркадзя Русецкага "Аб забароне палення ў будынках універсітэта" пачаў дзейнічаць у Віцебскім дзяржаўным універсітэце. Цяпер у гэтай буйной навучальнай установе Віцебска паленне тытуню ў любым месцы не толькі лічыцца парушэннем правілаў унутранага распарадку (гэта было і раней), але і можа быць пакарана (у залежнасці ад асобы парушальніка) пазбаўленнем прэміі да персанальнай надбаўкі да зарплаты, стыпендыі, а ў асобных выпадках нават пацягнуць за сабой звальненне супрацоўніка або выключэнне студэнта (або студэнткі) з ВНУ.

Загад суровы і наўрад ці мае адпаведнасць агульнаму заканадаўству, хоць логіка ў ім ёсць, калі мець на ўвазе, што універсітэт выхоўвае ў асноўным школьных настаўнікаў.

Даспадобы забарона прыйшлася далёка не ўсім ды і спужала нямногіх. За першыя два месяцы пасля яго выдання зафіксавана 20 парушальнікаў. Адміністрацыя ўпэўнена, што так ці інакш пакараны будуць усе, аднак з самымі жорсткімі мерамі ўздзеяння вырашана пакуль не спяшацца.

## А зарплата ўсё спазняецца

Нягледзячы на адміністрацыйныя меры ўздзеяння, якія прымаюць улады Віцебшчыны па ліквідацыі даўгоў па зарплаце, на 1 сакавіка зарплату за студзень не атрымалі больш як 450 калектываў. Пераважная іх колькасць уваходзіць у аграпрамысловы комплекс. Найгоршае становішча ў Сенненскім, Лепельскім і Расонскім раёнах.

Несвоечасова разлічваюцца са сваімі працаўнікамі і гарадскія прадпрыемствы. Найбольшыя даўгі ў віцебскага завода "Вістан" і акцыянернага таварыства "Орша". 119 прадпрыемстваў і арганізацый у 14-ці раёнах затрымліваюць выплату дзіцячай дапамогі за снежань і студзень.

## Гараць хаты, гінуць людзі

Як і папярэджвалі пажарныя напярэдадні зімы, з яе надыходам на Віцебшчыне пачасціліся пажары ў прыватных дамах з-за няспраўнасці пячнога ацяплення.

У многіх людзей, асабліва сельскіх жыхароў і пенсіянераў, няма ні сіл, ні сродкаў, каб адрамантаваць свае коміны. Дарэчы, і гінуць у асноўным пенсіянеры, часцей — тыя з іх, хто любіць прыкласціся да бутэлькі і запаліць цыгарку перад сном.

Спачатку года ў вобласці адбылося ўжо амаль 380 пажараў, у агні загінулі 58 чалавек. Толькі за адзін святочны дзень 8 Сакавіка ад пажараў у прыватных дамах развіталіся з жыццём 10 жыхароў Віцебшчыны.

**Сяргей БУТКЕВІЧ.**

## Абваліліся шэсць балконаў

Шэсць балконаў абваліліся ў трохпавярховым шматкватэрным доме ў вёсцы Мішкавічы Шумілінскага раёна.

На зямлю ўпалі шэсць сумежных балконаў першага, другога і трэцяга паверхаў памерам 6 на 1,2 метра. Абрушванне справакавала падзенне двух балконаў трэцяга паверху. Паколькі ў гэты момант на балконах і пад імі нікога не было, удалося пазбегнуць ахвяраў.

Цяпер на месцы здарэння працуе камісія, якой трэба будзе вызначыць прычыну абвальвання і ацаніць стан падмурку пабудовы 1981 года.

**Дзмітрый БЕЛЬСКІ.**

## Пенсіянер забіў пенсіянерку

Жыхар вёскі Наваельня Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, які падазраецца ў забойстве, спрабаваў скончыць жыццё самагубствам. З пятлі яго выцягнулі ратавальнікі МНС.

75-гадовы пенсіянер падазраецца ў забойстве сваёй 64-гадовай суседкі. Паводле версіі следства, раніцай 11 сакавіка ён учыніў бойку з суседкай, з якой даўно меў складаныя адносіны. Жанчына спрабавала схавацца ў доме сваёй сяброўкі, аднак пенсіянер усё ж нанёс ёй некалькі ўдараў па галаве, ад якіх суседка памерла на месцы. Потым зламыснік падпаліў хлеў суседкі, уласныя дом і хлеў і паспрабаваў скончыць жыццё самагубствам у летніку.

**Ірына ЧАРНЯЎКА.**

СЛОВЫ І СПРАВЫ

# Забіраюць апошнія грошы і кажуць, што клапоцяцца пра народ...

Я даўно прыкмеціў: як толькі прадстаўнікі ўлады пачынаюць гаварыць аб вялікім клопаце пра народ, чакай пагаршэння жыцця.

Выступаючы на другім Усебеларускім народным сходзе ў маі 2001 года, Аляксандр Лукашэнка сцвярджаў, што мэта ўлады — амаль двухкратнае павышэнне дабрабыту беларускага народа. Далей ён абяцаў падтрымліваць нашых людзей пры аплаце камунальных паслуг, узяць частку расходаў на плечы дзяржавы.

Здавалася б, радавацца трэба было пасля такіх слоў. Але мяне яны не супакойвалі. Чаму? Зразумеў толькі праз год, калі імкліва сталі расці ўверх тарыфы за тыя ж камунальныя паслугі.

Дарэчы, 11 лютага гэтага года Аляксандр Лукашэнка моцна крытыкаваў урад за "неабгрунтаванае павышэнне тарыфаў і цэн на камунальныя паслугі". 19 лютага, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра Навіцкага, ён зноў цікавіўся гэтым. Радавацца? Чаму?

Калі за снежань я заплаціў камунальшчыкам 52,2 тысячы рублёў, дык за студзень прыйшлося выкласці 70 тысяч рублёў, на 17 тысяч болей. Вось вам і вывады ўрада з лукашэнкаўскай крытыкі пра "неабгрунтаванае павышэнне тарыфаў і цэн на камунальныя паслугі". Выходзіць, "абгрунтавалі" і... павысілі іх яшчэ.

21 лютага гэтага года Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел ва ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню абаронцаў Айчыны, на якім паабяцаў, што памылка, якую дапусціў урад, павысіўшы цэны на камунальныя паслугі, будзе выпраўлена ў бліжэйшы час. Здавалася б, як тут не парадавацца! Але ж...

12 сакавіка я атрымаў чарговы квіток на аплату камунальных плацяжоў. Кошт аплаты зноў вырас. Напомню, што калі за студзень заплаціў камунальшчыкам 70 тысяч, дык за люты налічылі 75 тысяч рублёў. А люты ж — кароткі месяц, у ім усяго 28 дзён. Дык што, калі б ён быў такі працяглы, як студзень, дык прыйшлося б выкласці ўжо за 80 тысяч? Вось вам і цана абяцання Аляксандра Рыгоравіча наконт хуткага выпраўлення "памылкі з цэнамі за камунальныя плацяжы".

Цяпер я адразу выключаю тэлевізар, калі нейкі высокі чыноўнік пачынае гаварыць. Баюся, раптам зноў распачне гаворку пра клопат аб народзе...

**Алесь ДРАБЧУК.**

# Открытое письмо

## президенту Республики Беларусь А.Г.Лукашенко

Господин президент!

Развернутая в Республике Беларусь массовая пропагандистская кампания в защиту президента Ирака Саддама Хусейна беспрецедентна. Не проходит и дня, чтобы граждане страны не узнали то о митингах в защиту правящего в Ираке режима, то о сборе добровольцев в "живой щит", то о делегации мэрии Багдада, то о возможном приезде сына Хусейна... Государственные СМИ заполнили свой эфир и газетные страницы проклятьями в адрес администрации президента Буша. Подвергается сомнениям и сложная многовекторная политика по иракскому кризису, которую проводит Российская Федерация.

Политика правительства США против режима С. Хусейна продолжает находиться в рамках резолюции Совета Безопасности ООН № 1441. Если Ирак по каким-либо причинам откажется выполнять любой из пунктов данной резолюции, то ни для кого не является секретом, что резолюция № 1441 не исключает применение силы против правительства Ирака. Следовательно, белорусская государственная пропагандистская машина развязала кампанию не только против США, но и всего мирового сообщества, представители которого в ООН консолидировано потребовали от Ирака выполнить конкретные задачи по ликвидации оружия массового поражения. В итоге, умудрившись ввязаться в конфликт за три тысячи километров от нашего порога, мы противопоставили себя всему прогрессивному человечеству.

Как и все здравомыслящие люди, я и мои сторонники решительно выступаем против войны. Мы, родившиеся на земле, которая в результате чудовищных авантюр политических маньяков XX века оказалась обильно политой кровью нашего народа, прекрасно осознаем масштаб угрозы, нависшей над мирным населением далекой страны. В то же время ни для кого не является секретом, что в последние месяцы мы наблюдаем подлинную всемирную трагедию — подмену антивоенного движения борьбой за безнаказанность одиозных режимов. Ввиду этого, я считаю, что должна быть создана система международной ответственности правительств за внутреннюю и внешнюю политику, если она угрожает жизни миллионов людей, проживающих в соседних и в их собственных странах. Наша планета слишком мала, чтобы терпеть на ней опасные, не умеющие жить в добрососедстве или хотя бы в режиме мирного сосуществования политические силы.

С. Хусейн, используя иракский народ в роли заложника своего режима, занят поиском путей личного спасения. Он стремится уйти от ответственности за развязывание в течение последних двадцати лет четырех войн, на которых полегло почти два миллиона человек, использование против соседей и собственного народа химического оружия, обстрелы пяти соседних стран ракетами. Предложение Лиги арабских стран президенту Ирака уйти в отставку говорит о том, что и среди арабов растет понимание, что иракский кризис только частично можно считать столкновением интересов США и Ирака. Мировое сообщество выразило готовность обеспечить гарантии безопасности иракскому президенту. Думало ли белорусское руководство, занятое раздуванием просаддамовской и антиамериканской истерии, в каком геополитическом тупике оно окажется, если С.Хусейн исчезнет из Багдада? Просчитывало ли оно последствия собственного политического авантюризма на международной арене?

Анализируя действия руководства государства и подконтрольных ему профсоюзов в отношении иракского кризиса, невольно приходишь к выводу, что люди, отвечающие за судьбу белорусского народа и национального белорусского государства, не понимают меру своей ответственности. Играя судьбами десятимиллионного народа, власти Республики Беларусь, опираясь на свои личные интересы, которые ничего общего не имеют с чаяниями граждан страны, втягивают Республику Беларусь в войну. Более того, этот разгул геополитического авантюризма направлен против национальных интересов белорусского государства и его народа.

В Вашем окружении, господин президент, возобладало мнение, что "война все спишет". Даже советы и рекомендации Ваших коллег — президентов Российской Федерации, Украины и Казахстана, не смогли убедить Вас, что участие белорусского государства в международном конфликте на стороне режима С.Хусейна грозит Республике Беларусь оказаться в ряду "кризисных" стран вместе с КНДР.

Я и люди, которые меня поддерживают, призываем Вас немедленно отмежеваться от поддержки президента Ирака С.Хусейна, скоординировать белорусскую политику в отношении иракского кризиса с решениями Совета Безопасности ООН и позицией союзного государства — Российской Федерацией, прекратить антиамериканскую и просаддамовскую пропагандистскую кампанию.

Ситуация может сложиться так, что завтра будет мучительно стыдно за то, что мы по собственной воле оказались международными отщепенцами. Напоминаю, что Вы несете персональную ответственность за мир и спокойствие на белорусской земле.

**Александр ЯРОШУК,**
**гражданин Республики Беларусь.**

ИРАКСКИЙ КРИЗИС

# Противостояние

*Ведущие страны настойчиво ищут общий подход в решении иракской проблемы. Но пока безуспешно.*



*Тони Блэр отстаивает свою позицию.*

Совет Безопасности ООН обсудил инициативу Великобритании, предложившей конкретные меры по разоружению Ирака, которые могли бы предотвратить войну. Лондон выставил шесть требований к Хусейну. В частности, Англия потребовала, чтобы президент Ирака Саддам Хусейн выступил по телевидению с признанием — он пытался утаить оружие массового поражения, но теперь принял решение уничтожить его. Британские дипломаты не исключают, что срок ультиматума Багдаду — разоружиться или быть разоруженным силой — может быть продлен.

Соединённые Штаты отказались поддержать предложенные Великобританией поправки к новой резолюции по Ираку. Переговоры между британскими и американскими дипломатами накануне закончились тем, что поправки были представлены на рассмотрение Совета Безопасности ООН только от имени правительства Великобритании. США настаивают на том, чтобы голосование прошло по тому варианту резолюции, который был первоначально предложен Соединёнными Штатами, Великобританией и Испанией. Представитель США в ООН Джон Негропонте заявил, что Вашингтон может согласиться лишь на незначительную отсрочку. Россия, Франция и Германия скептически отнеслись к предложению Великобритании.

Между тем большинство американцев склонны винить Организацию Объединенных Наций за неспособность разрешить иракскую проблему. В последний месяц американское общественное мнение твердо склонилось в поддержку принудительного разоружения режима Саддама Хусейна даже без санкции Совета Безопасности ООН. Результаты опроса, проведенного газетой "Нью-Йорк Таймс" и телекомпанией CBS, неожиданны. Оказывается, последний месяц, отмеченный массовыми демонстрациями в пользу мирного разрешения иракского кризиса, развел по противоположным углам не только лидеров США и нескольких европейских стран, но и общественное мнение по обеим сторонам Атлантики. В то время как европейцы подавляюще выступают за так называемое мирное разрешение иракского кризиса посредством Совета Безопасности ООН, все большее число американцев верит в то, что ООН неспособна на это. 58 процентов опрошенных считают, что Организация Объединенных Наций плохо справляется с ролью лидера в разрешении иракского кризиса. За последние месяцы число скептиков выросло на 10 процентов.

**Алесь ДРАБЧУК.**

ДАЙДЖЕСТ

## В убийстве Джинджича подозревают бывшего полицейского



Правительство Сербии предполагает, что убийство премьер-министра Зорана Джинджича (на снимке) подготовила группа под руководством бывшего командира полицейского спецподразделения. В заявлении, распространенном правительством, сообщается, что имя бывшего полицейского, лояльного экс-президенту Сербии Слободану Милошевичу полевого командира Милорада Луковича находится в списке подозреваемых, состоящем из 20 фамилий. Кроме него под подозрение попали некоторые лидеры сербских преступных группировок.

Премьер-министр Сербии Зоран Джинджич накануне умер в больнице, после того как получил несколько огнестрельных ранений в спину и живот. Снайпер расстрелял Джинджича, когда тот выходил из автомобиля у Дома правительства в центре Белграда. Полиция оцепила прилегающие к месту преступления кварталы. Все выезды из города перекрыты, отправления поездов и вылеты самолетов задержаны. По сообщениям очевидцев, полицейские задержали двоих человек по подозрению в причастности к убийству. Исполняющая обязанности президента Сербии Наташа Мичич объявила о введении в стране чрезвычайного положения. По заявлению Мичич, такое решение принято из-за "угрозы конституционному строю" Сербии.

## Билл Клинтон продал свои слова по 1000 долларов за штуку



Бывший президент США Билл Клинтон и главный его оппонент на президентских выборах 1996 года Боб Доул подписали контракты с телекомпанией "Си-Би-Эс" о совместном участии в 10 программах "60 минут". Оба политика предстанут перед зрителями в разделе программы, называющейся "Мнение—Контрмнение". Этот раздел, носящий такое название с 1979 года, в их честь будет переименован в "Доул—Клинтон". За каждое из произнесенных в программе слов Билл Клинтон получит по тысяче долларов. Однако при этом в контракте оговорено, что его выступление не должно содержать более 90 слов. Общая же сумма 10-недельного контракта превышает миллион долларов.

## Семьи погибших палестинских боевиков получили от Хусейна 245 тыс. долларов

Семьи палестинцев, убитых израильскими военными, получили от президента Ирака Саддама Хусейна по 245 тыс. долларов. Чек был передан палестинской проиракской организации. Эти деньги должны быть переданы семьям палестинцев, которые погибли и пострадали за время палестино-израильского конфликта. "Саддам Хусейн поддерживает нашу борьбу. Таким образом он оказывает уважение погибшим мученикам", — заявили на церемонии передачи чека. Семья погибшего палестинского террориста-самоубийцы получила 25 тыс. долларов, 22 семьи, чьи родственники погибли во время рейдов израильской армии, получат по 10 тыс. долларов.

## Посол Ирака обвинил румынские спецслужбы в попытке его вербовки

Посол Ирака в Бухаресте обвинил румынские спецслужбы в попытке его вербовки. По словам посла Саада Хамида Маджида, к нему обратились представители румынских спецслужб с предложением обеспечить послу и его семье "финансирование и соответствующие условия" в случае его согласия сотрудничать с ними. Иракский посол назвал этот инцидент "безнравственным и недопустимым", нарушающим дипломатические нормы. Сегодняшнее заявление посла стало продолжением дипломатического скандала. Накануне Румыния выслала пятерых иракских дипломатов за деятельность, несовместимую с их статусом.

## Великобритания требует от Саддама покаяться в телеэфире

Президент Ирака Саддам Хусейн должен в телевизионном выступлении признать, что в Ираке есть оружие массового поражения, и пообещать предъявить и затем уничтожить его. Такое требование содержится в подготовленном британским МИДом списке условий, которые позволят Хусейну избежать войны. Всего список содержит шесть пунктов, которые планируется добавить к проекту новой резолюции по Ираку. Помимо публичного выступления, Великобритания требует от Хусейна разрешить 30 иракским ученым выехать с семьями на Кипр и провести конфиденциальные беседы с инспекторами ООН. Хусейн также должен признать, что в Ираке создан беспилотный летательный аппарат, способный распылять отравляющие вещества по большой территории. Кроме того, по словам анонимного источника в британском правительстве, Лондон требует от Хусейна принять законы, запрещающие иракским государственным компаниям производить оружие массового поражения.

ІНТЭЛІГЕНТ

*Аляксей МАРАЧКІН:*

# «Жыве Беларусь, покуль мы не знямелі»



Хлопчык стаяў ля акна, узіраючыся ў белы абрус, разасланы завеяй на ўсё наваколле. Нідзе ні слядочка, і дарогі не відно пад сумётамі... Ён яшчэ не ведаў тады, што пройдзе час, і з патанулай у снежных гурбах вёсачкі на Магілёўшчыне пачнецца яго ўласная дарога, і ён пракладзе на ёй свой след, адметны і глыбокі. І, ужо знаным мастаком, з'ездзіўшы ўсю Беларусь і пабачыўшы шмат далёкіх краёў, будзе зноў і зноў вяртацца да бацькоўскага парога — пачатку ўсіх пачаткаў, да першароднай цішыні і чысціні, з якіх вырастае сусвет чалавечага духу і лёсу. Лёс Бацькаўшчыны і ўсёй планеты Зямля.

Ён будзе вяртацца дамоў і тады, калі ўжо не стане бацькоў і абязлюдзее вёска, накрытая зласнай чарнобыльскай хмарай. Хтосьці назаве прароцтвам яго даўняе, напісанае яшчэ ў сярэдзіне 70-х палатно "Касмічная пачвара над маёй вёскай". Але трывожнае прадчуванне бяды, што навісла над ціхім аснежаным жытлом, над полем, над усё роднай зямлёй, улоўленае чуйным сэрцам яшчэ ў "спакойна-застойныя" часы, не вычэрпваецца толькі чарнобыльскай навалай, набывае куды больш глабальнае, сімвалічнае гучанне. Ён не хацеў, не хоча, каб спраўджвалася тое трагічнае прадчуванне, аднак...

Вось яна, праз гады і гады, вёска яго дзяцінства: пустэча і злосны посвіст ветру наўсцяж. Па некранутым снежным покрыве чалавек у гарадскім капелюшы кіруецца да маўклівага падворка, адчыняе дзверы ў кінутую, разрабаваную хату з выбітымі вокнамі, дзе калісьці віравала жыццё. Але мастак — чарадзей, ён можа немагчымае. Пачынае развешваць на сценах, у двары на агароджы свае карціны — дар тым, каго не забыўся, і ўваскрашае адышоўшае ў нябыт. Глядзяць з тых палотнаў родныя краявіды і дарагія аблічча маці Хадоры і бацькі Антона, бабулі Марылі і дзеда Андрэя. Ён бачыць і чуе іх, як наяве, бачыць і сваіх вясковых сябрукоў і суседзяў, што любілі завітваць у гасцінную хату. Былое сямейнае гняздо зноў поўніцца жыццём, шматгалоссем. А дзесьці ля акна ўзнікае і ён сам, колішні хлапчук Ляксейка, ахоплены яшчэ няяснымі марамі і згадкамі...

На незвычайную — напэўна, самую незвычайную ў свеце — выставу для нябачных, але відушчых родных душ зазірне адзінокая кабета з апошніх жыхароў вёскі (цяпер і яе ўжо няма). У руках яе абраз "Маці Божая ахвяр Чарнобыля", намаляваны іх Ляксейкам. Такі ж абраз пэндзля Аляксея Марачкіна штогод ачольвае калону "Чарнобыльскага шляху" ў Мінску. Як "Маці Божая Курапацкая" — шэсці ў Курапаты.

Уваскрэшанне Бацькаўшчыны праз пакуты, страты, выпрабаванні — для новага жыцця, для будучыні... Гэта і змест, і мэта ўсяго, чым дыхае і што робіць выдатны наш сучаснік, творца магутнага і магічнага таленту з мастакоўскім імем **Алесь MARA**. Сваю мару аб вольнай, шчаснай, прыгожай краіне Беларусь ён няўхільна і аддана набліжае нястомнай і надзвычай плённай працай: і ў цішы майстэрні, і на маляўнічым улонні прыроды, і ў віры грамадскага жыцця. Гэта ўсё для яго адно, непадзельнае цэлае — змаганне ўсімі сіламі душы і мастакоўскага дару за Нацыянальную ідэю, наш Беларускі Дом.

Усё гэта прыйшло да яго, сталася ягонай натурай змалку з малаком маці, з подыхам роднай зямлі, высакароднымі традыцыямі продкаў. Ён узрасце на гэтых традыцыях і, ўвабраўшы ў сябе незлічоныя каштоўнасці сусветнай культуры, ніколі не здрадзіць сваім караням, крыніцы свайго жыцця і натхнення. Варта пабываць хаця б на выставе з характэрнай назвай "Пачатак", што экспануецца зараз у сталічнай галерэі "Мастацтва" на праспекце Скарыны, каб пераканацца: з першых крокаў у творчасці, першых лірычных пейзажаў і партрэтаў землякоў па сёння, калі ў вечным пошуку дасканаласці і выразнасці жывапісец дасягае бліскучага майстэрства і вытанчанасці ў самых розных стылях, жанрах і прыёмах, магістральная лінія яго жыцця і творчасці застаецца нязменнай: вернасць сабе самому, сваім ідэалам, дарагой Радзіме.

На любой выставе — незалежна ад таго, карыстаецца ён сродкамі "старога, добрага" рэалізму ці пераходзіць на сучасны "сюр", палотны Аляксея Марачкіна пазнаеш здаля па глыбіннай беларускасці і адухоўленасці. Яны бяруць у палон шчырай спавядальнасцю, выпраменьваюць энергетыку душэўнага хвалявання, якое перадаецца гледачу, вабяць сваёй паэтычнасцю і метафарычнасцю, філасофскім асэнсаваннем мінулага, сучаснага і будучага. Яны прыгожыя і прыцягальныя нейкай неразгаданай таямнічасцю, без якой няма мастацтва.

Ён можа ствараць велічную партрэтную галерэю славутых постацяў айчыннай гісторыі і культуры — Рагнеды, Вітаўта, Гусоўскага, Скарыны. Пераносіць на палатно букет сціплых палявых кветак з іх няўлоўным пяшчотным водарам. Размалёўваць старажытнымі міфалагічнымі вобразамі бабуліну прасніцу і драўляныя дзверы сялянскай хаты ці распісваць Беларускую аўтакефальную царкву ў заакіянскім горадзе Кліўлендзе. Апусціць на аснежаны дол з вышынь уласнай фантазіі дзівосных, нябачаных птушак. Перакрэсліць убогую прымітыўнасць, асмяяную класікам у знакамітым іранізме "Бачу плот — пішу плот", напісаўшы... рэальны плот у сваім двары ці старую печ у бацькоўскай хаце. Але гэта заўжды — высокае мастацтва, што дорыць адкрыццё і вярэдзіць душу. Гэта заўжды — Беларусь, яго любая Маці. У кожным творы чуецца яе дыханне, б'ецца яе сэрца, свеціцца яе непаўторны Лік. У кожным творы — пяшчота і адданасць сына, гордасць і захапленне, гатоўнасць слугаваць ёй да апошняга. І — адвага ісці насустрач ветру, гаварыць пра самае істотнае: што будзе заўтра з Бацькаўшчынай і з намі? Няўжо дапусцім, каб назаўсёды зніклі ў небыццё?

Я спытала ў яго:

— Гэта, напэўна, вельмі цяжка — дакранацца да самага балючага, што смыліць не толькі табе?

— Так, — пагаджаецца Аляксей Антонавіч. — Толькі не дай Божа пазбавіцца гэтага цяжару і болю. Пустым, нікчэмным станецца тваё мастацтва і ты сам — нават пры наяўнасці шумнага знешняга поспеху.

Замкнуцца ў "вежы са слановай косці", не зважаючы, што дзеецца за яе сценамі? Маляваць адно бяздумныя "вясёлыя карцінкі" сярод мора людской бяды? Гэта не для яго — не для такой удумнай, няўрымслівай і дзейснай натуры. І ён працуе апантана і нястомна, ладзіць выставу за выставай — дома і далёка ад яго. У многіх краінах свету пабывалі карціны Аляксея Марачкіна, нямала з іх атрымалі пастаянную прапіску ў мастацкіх галерэях і прыватных зборах замежных краін. Наш госць з Вялікабрытаніі містэр Сайман (ён спецыяльна прыехаў у Мінск на адкрыццё выставы "Пачатак") лічыць за гонар прымаць у сваім музеі цудоўныя творы аднаго з самабытнейшых і яркіх сучасных майстроў Беларусі. Можа, як ніхто іншы, той умее на мове свайго часу сказаць аб вечным, увасобіць неперамožную сілу і ціхую красу роднай зямлі.

Асабліва любіць Алесь MARA пісаць зіму з яе мроямі. Авеяная халодным сіверам, скутая белым панцырам роўнядзь хавае да пары не абуджаную сілу, якая прарвецца бурным вясновым патокам. Ён любіць белы снегавы колер, нацыянальны колер беларусаў: сімвал чысціні і надзеі, мелодыі святла. "Настальгія па белым снезе" — назва аднаго з яго палотнаў.

Бадай, гэтак жа можна было б назваць і незвычайнае, унікальнае выданне — "Аўтаманаграфію" Алеся MAРЫ, прэзентацыя якой адбылася ў мастацкай гасцёўні сталічнага Палаца моладзі. Пад адной вокладкай — у рэпрадукцыях лепшых работ, дакументальных здымках з уласнага архіву, у вершах, празаічных абразках, дзённікавых запісах мастака — шматграннае, напоўненае жыццё яркай асобы.

...На тым вечары, які стаўся святам-сюрпрызам для ўсіх, хто прыйшоў, Аляксей Антонавіч дзяліўся запаветным, чытаў свае паэтычныя творы і... спяваў, ды яшчэ як! Калісьці ад дзеда пачуў ён старажытную народную баладу, і яна прагучала ў гонар і памяць яго пашанотнага сялянскага роду, нашых слаўных продкаў. Потым свае галасы ў песні на вершы Аляксея Марачкіна ўплялі вядомы бард Кастусь Герашчанка, гурты "Ліцьвіны" і "Пліса"...

Вось ужо праўда дык праўда: вялікі талент — талент кругом. Свой сыноўскі доўг перад Бацькаўшчынай ён сплачвае не толькі пэндзлем, а і грамадзянскай мужнасцю, адстойваннем яе незалежнай, годнай будучыні. Фігуру гэтага знешне "ціхага", з дзіцячай усмешкай чалавека нязменна сустракаеш сярод актыўных удзельнікаў акцый дэмакратычнай грамадскасці. Ён — адзін з ініцыятараў і арганізатараў Усебеларускага сходу інтэлігенцыі, які мае адбыцца паслязаўтра.

Ён усцешаны, што разам з ім — сын Ягор, паплечнік і прадаўжальнік бацькавай справы, жонка Ірына, руплівіца на ніве беларушчыны. З ім — сябры, аднадумцы. З ім — сама Беларусь.

**Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.**

## В Болгарии псих угнал поезд со 120 пассажирами

Бывший железнодорожник, страдающий психическим заболеванием, угнал от станции Бургас пассажирский состав. Как сообщили в администрации станции Бургас, инцидент произошел во вторник днем, когда Илко Христов, воспользовавшись минутным отсутствием машиниста, угнал тепловоз с пятью вагонами, в которых в общей сложности находились 120 пассажиров. Серьезных последствий удалось избежать благодаря вмешательству двух полицейских, которые в Болгарии всегда сопровождают пассажирские поезда. Полицейские, перебравшись в локомотив, остановили состав и арестовали Христова. Преступник направлен на принудительное лечение.

## Пойман очередной бен Ладен


Иранское национальное радио сообщило об аресте на границе Ирана и Пакистана международного террориста Усамы бен Ладена. Никаких деталей об аресте террориста пока не сообщается. Информация о поимке бен Ладена была тут же прокомментирована администрацией Белого дома и правительством Пакистана. Вашингтон не подтвердил, но и не опроверг эту информацию, сообщив, что ему "нечем подтвердить сведения об аресте Усамы бен Ладена". Министр внутренних дел Пакистана по этому поводу заявил, что данная информация представляется "безосновательной".

# Гора родила мышь,

## или Стоит ли хвастаться создателям президентского интернет-сайта?

**Недавно государственные газеты совместно с Белорусским телевидением разразились сенсацией: в стране создана "самая информированная электронная газета страны". Многие сразу же задались вопросом: "Что же это за газета такая?" Оказывается, шум подняли по поводу обновления президентского интернет-сайта (адрес — www.president.gov.by). Обычное рабочее обновление первый заместитель главы Администрации президента Станислав Князев назвал ни больше ни меньше как "прорывом, который сделан на информационном поле".**

**Мы решили подробно изучить этот самый прорыв, сравнить новую версию президентской интернет-странички со старой, а также подсмотреть аналогичный сайт президента США Джорджа Буша (адрес — www.whitehouse.gov) и поделиться своими впечатлениями с читателями.**



